# Вандроўка ў літаратуру, якая не павінна скончыцца

**Нядаўна ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў літаратурнага конкурсу «Беларускі салавей», прымеркаванага да 135-годдзя з дня нараджэння Змітрака Бядулі. «ЛіМ» быў адным з інфармацыйных партнёраў конкурсу, прадстаўніца рэдакцыі з'яўлялася сябрам журы. Акрамя расповеду пра падзеі літаратурнага спаборніцтва, на суседняй старонцы да ўвагі чытачоў — эсэ Валянціны Шэўчык, якое было адзначана рэдакцыяй у ліку найлепшых.**




*Слова мае сын Змітрака Бядулі Яфім Плаўнік.*

…Што ёсць талент? Гэтае пытанне цікавіла ва ўсе часы. Не сталі выключэннем і беларускія пісьменнікі, якія разважалі над гэтай тэмай і шукалі адказы, ствараючы вобразы і алегорыі. «…Сярод тысяч качаноў капусты на гародзе ёсць адзін качан — талент. Па выглядзе ён не адрозніваецца ад іншых качаноў, аднак у гэтым качане ёсць фокус-покус: адарвеш лісток — шаўковы, другі — сярэбраны, трэці — залаты. Можаш нарваць гару лісткоў, а качан цэлы. Такі качан называецца талент. Кожны заяц думае, што яго качан з талентам. А паспрабуй зайцу праўду сказаць, што яго качан без таленту, дык ён табе выдзера і вочы, і вушы, і галаву адкруціць…» — пісаў Змітрок Бядуля ў адным з найлепшых твораў, які, сярод іх быў шасцігадовы першакласнік, а найстарэйшы разменяў восьмы дзясятак. Не ўсе яны, дарэчы, пражываюць у Беларусі: геаграфія конкурсу шырокая — адна з работ была даслана з Тамбоўскай вобласці Расіі. Канкурсанты

Аргкамітэт, які з'яўляўся «маторам» праекта і займаўся незаўважнай, на першы погляд, работай, але без якой не атрымаўся б конкурс, прадстаўляла галоўны бібліёграф інфармацыйна-аналітычнага аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Юлія Амосава. Яна адзначыла, што ў многіх творчых работах дзеці зрабілі

Рэдактар часопіса «Бярозка» Ксенія Сітнік адзначыла намінанта Дар'ю Белякову — яе работа рыхтуецца да друку ў найбліжэйшым нумары часопіса. Словы ўдзячнасці і ў адрас супрацоўнікаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, і ўдзельнікаў выказалі намеснік дырэктара радыёстанцыі «Цэнтр FM» Алёна Пятрова, рэдактар канала «Культура» Беларускага радыё Наталля Сіротка і прадстаўнікі іншых інфармацыйных партнёраў конкурсу. Наталля Сіротка паведаміла, што аўдыяфайлы, якія былі дасланы ўдзельнікамі конкурсу, падрыхтаваны да выхаду ў эфір у праграме для дзяцей «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» ў рубрыцы «Літарынка». Пасля ўрыўкі з твораў будуць гучаць і ў прафесійным выкананні акцёраў, якія працуюць на радыё.

— Для ўдзельнікаў конкурсу важна пабачыць свае імёны ў ліку пераможцаў, але не менш важна і тое, што праз гэтае спаборніцтва аматары творчасці змаглі пабачыць адно аднаго. Тыя, каму цікавы літаратурны працэс, пераканаюцца, што яны не адзінокія, што побач ёсць людзі, якім цікава тое самае, і яны вельмі блізка, — разважала Наталля Сіротка.

Па яе словах, праграма канала «Культура» Беларускага радыё «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» дасць магчымасць маладым творцам убачыць сябе на ўяўным п'едэстале гонару, знайсці аднадумцаў, вартых увагі і сяброўства. І праз гэты конкурс сплятуцца і творчыя, і сяброўскія саюзы.

Прыемнай акалічнасцю для прысутных на цырымоніі ўзнагароджання сталі музычныя выступленні вучаніцы Дзіцячай



*Святлана Мажароўская дорыць вышываны партрэт Змітрака Бядулі Нацыянальнай бібліятэцы.*

па меркаваннях літаратуразнаўцаў, апярэдзіў свой час — у казцы-прытчы «Сярэбраная табакерка». Гэтая казка, а таксама апавяданні «Бондар», «На Каляды к сыну» і аповесць «Салавей» былі прапанаваны як тэмы для напісання эсэ ахвотным паўдзельнічаць у творчым спаборніцтве, прымеркаваным да юбілейнай даты слыннага пісьменніка. Конкурс пад назвай «Беларускі салавей» праходзіў у межах віртуальнага праекта Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі «На хвалі часу, у плыні жыцця», распачатага напрыканцы 2018 года.

Аўтары работ імкнуліся абыграць сваю версію сюжэта па любым з чатырох твораў. Гэта магло быць у форме прыквела (што па храналогіі папярэднічала б падзеям твора) альбо сіквэла (што магло б стаць працягам). Як варыянт прымалася і развіццё падзей, паралельнае арыгінальнаму, дзе сустракаліся б ужо знаёмыя па асноўным сюжэце другарадныя героі і эпізоды — спін-оф.

Конкурс сабраў больш ад 800 удзельнікаў рознага ўзросту: самы малодшы паспрабавалі сябе ў ролі суаўтараў Змітрака Бядулі.

Улічваючы вялікую колькасць удзельнікаў, журы прыняло рашэнне вызначаць пераможцаў па ўзроставых катэгорыях: да 12 гадоў, 14—15 гадоў, 16—22 гады і ад 23 гадоў. Акрамя таго, былі ўведзены дадатковыя намінацыі. Некаторыя ўдзельнікі напісалі эсэ ў вершаванай форме. Каб адзначыць іх спробы, аргкамітэт конкурсу прапанаваў намінацыю «За любоў да паэзіі».

— Спаборніцтва было не столькі актам ушанавання памяці пісьменніка, колькі асэнсаваннем яго творчасці, — зазначыла падчас адкрыцця музычна-літаратурнай імпрэзы дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Аксана Кніжнікава.

Павіншаваў і выказаў цёплыя зычэнні ўдзельнікам Яфім Плаўнік, сын Змітрака Бядулі, які быў запрошаны на ўрачыстасць у якасці ганаровага госця:

— Для ўсіх гэта была вандроўка ў літаратуру, і пажадана, каб на гэтым яна не скончылася.

малюнкі да апавяданняў Змітрака Бядулі, стварылі відэаінсцэніроўкі. Некаторыя нават напісалі даследчыя працы. А таксама нагадала, што на партале Нацыянальнай бібліятэкі створана старонка літаратурнага конкурсу, дзе кожны можа азнаёміцца з умовамі спаборніцтва і прадстаўленымі да ўдзелу работамі — яны пададзены ў алфавітным парадку. Юлія Амосава адзначыла, што ўсе работы цікавыя і важныя, незалежна ад таго, увайшлі яны ў лік пераможцаў ці не.

Таццяна Лаўрык, загадчыца сектара аналітычнай інфармацыі па культуры і мастацтве Нацыянальнай бібліятэкі, сябар журы і аргкамітэта конкурсу, падзякавала супрацоўнікам кніжніцы за актыўны ўдзел у арганізацыі конкурсу, за зладжаную, скаардынаваную работу па падрыхтоўцы выніковага мерапрыемства.

музычнай школы мастацтваў № 9 г. Мінска, удзельніцы конкурсу Веранікі Шабуні і кіраўніка народнага літаратурнага тэатра «Жывое слова» Алесі Сівохінай, а таксама прачулае выкананне вершаў Змітрака Бядулі вучнямі сярэдняй школы № 34 г. Бабруйска.

Пераможцы конкурсу былі ўзнагароджаны дыпломамі і прызамі, сярод якіх запрашэнні на оперу «Тоска» Дж. Пучыні ў Вялікі тэатр оперы і балета, на прагляды спектакляў у Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр юнага гледача, іншыя памятныя падарункі.

Творы Змітрака Бядулі дораць светлыя пачуцці — менавіта імі натхнілася супрацоўніца Пінкавіцкай сельскай бібліятэкі Святлана Мажароўская, якая стварыла вышываны партрэт пісьменніка і падарыла яго галоўнай кніжніцы краіны.




*Аксана Кніжнікава ўручае падарункі пераможцам конкурсу.*

Рэдакцыяй газеты «Літаратура і мастацтва» была адзначана работа настаўніцы беларускай мовы і літаратуры з Любаншчыны Валянціны Шэўчык. Па нашым меркаванні, менавіта ў гэтым эсэ найбольш праявіўся крытычна-аналітычны падыход да разгляданага твора, што найперш вітаецца на старонках друку.

…А можа быць, талент ёсць у кожнага? Галоўнае — заўважыць яго і змалку развіваць, жывіць з крыніцы духоўнага багацця народа. Правядзенне літаратурных конкурсаў ды рознага роду спаборніцтваў добра таму спрыяе.

**Марыя ЯРАШЭВІЧ**
**Фота Кастуся Дробава**